Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

# НАЗАЎСЁДЫ РАЗАМ:
## гісторыя нацыянальна-дзяржаўнага станаўлення Беларусі
## *(да 65-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР)*

*Матэрыялы*
*Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*

Мінск, 28 верасня 2004 г.

Мінск 2004

Репозиторий БГПУ

нальную ідэю. Гэта было небяспечна для новага рэжыму, які імкнуўс закласці ў падмурак сваёй палітыкі ідэі пралетарскага інтэрнацы налізму. Аўтар аналізуе супярэчнасці ў культурна-нацыянальна палітыцы, паказвае, што партыйныя і савецкія органы імкнулі ўлічваць асаблівасці Заходняй Беларусі, што ўскосна ўплывала н культурную і адукацыйную палітыку ва ўсходніх абласцях БССР.

Пры ўсіх хібах савецкай таталітарнай сістэмы кіравання грама дствам, што адразу ж адчувалася і на заходнебеларускіх землях, абса лютная большасць іх насельніцтва ўсё ж перажывала вялікую радасц ад дзяржаўна-палітычнага аб'яднання з БССР. Людзей не пакідала вера што рана ці позна і іх любая старонка здабудзе для сябе поўны дзяр жаўны суверэнітэт, трывала стане на шлях незалежнага развіцця, якім ішлі, ідуць і будуць ісці ўсе цывілізаваныя народы.

Такім чынам, гісторыя Беларусі азначанага перыяду і лёс яе на сельніцтва хвалюе даследчыкаў, аб гэтым сведчыць і правядзенне сёння канферэнцыі з нагоды 65-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларус з БССР.

*Літаратура і крыніцы*


1. Ладысеў У. Цяжкі шлях выпрабаванняў // Беларускі гістарычны ча сопіс. 1994. № 1. С. 81—88.
2. Хацкевіч А. Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларус (1939—1941) // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 1. С. 89—94; № С. 70—76.
3. Адамушка У. Палітычныя рэпрэсіі 20—50-ых гадоў на Беларусі. Мн., 199 С. 101.
4. Ермалович В. И., Жумарь С. В. Огнем и мечем: хроника польского нацио налистического подполья в Белоруссии (1939—1953 гг.). Мн., 1994; Ся машка Я. Армія Краёва на Беларусі. Мн, 1994.
5. С. А. Сільвановіч, выкарыстоўваючы ў дысертацыйнай працы [5] шырока кола айчынных і замежных крыніц, разглядае антысавецкае падполле ў за ходніх абласцях Беларусі (верасень 1939 — чэрвень 1941 гг.).
6. Хацкевіч А. Змагаліся разам. Затым пасварыліся // Мінская праўда. 1992 21 ліст.; Ён жа. Армія Краёва: што мы пра яе ведаем // Звязда. 1993 30 крас.; Ён жа. «Аб раззбраенні груповак Арміі Краёвай у Нарачанскай Налібоцкай пушчах (1943—1944) // Беларускі гістарычны часопіс. 1996 № 1. С. 96—105, № 3. С. 44—55.
7. Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць Матэрыялы Міжнар. навук.-тэарыт. канф. 17—18 верасня 1999 г. Мн 2000.
8. Гнатоўскі М. Аб стане даследавання гісторыі і дзейнасці Арміі Краёвай Заходняй Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 1. С. 51—56
9. Летапіс Віленскай беларускай гімназіі. 1919—1944 // Спадчына. 1999. № 1 С. 29—60.





10. Мілеўскі Я. Е. Заходняя Беларусь: да пытання тэрыторыі і насельніцтва // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 3. С. 40—42.
11. Галубоўскі А. Інтэрпрытацыя паняцця «ўскраіны» з пункту гледжання развіцця цывілізацый // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 4. С. 20—28.
12. Мацко А., Кобяк С. Нелёгкая дорога к единению // Беларуская думка. 1999. № 8. С. 87—94.
13. Ладысеў У. Ваенныя падзеі верасня 1939 года ў лёсе беларускага народа // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 3. С. 3—11.
14. Улейчык Н. Фарміраванне савецкай інтэлігенцыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939—1950) // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 3. С. 12—14.
15. Яменчык Н. Пытанні рабочага руху ў Заходняй Беларусі. 1921—1939 гг. у польскай гістарыяграфіі // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 3. С. 16—17.
16. Лыч Л. Пад адным дахам // Літаратура і мастацтва. 1999. 17 вер. С. 5, 12.


***А. А. Каваленя***

## Да пытання ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР

Праблема ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР даволі шырока прадстаўлена ў гістарыяграфіі. У артыкуле звяртаецца ўвага на некаторыя дасягненні і пытанні, якія патрабуюць паглыбленага навуковага даследавання.

Ужо ў сярэдзіне 20-х гг. у нелегальным друку былі апублікаваны артыкулы, у якіх быў пакладзены пачатак асвятлення барацьбы беларускага народа Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, паказвалася дзейнасць падпольных камітэтаў КПЗБ і КСМЗБ. Публіцыстычныя працы гэтага перыяду нельга назваць навуковымі, іх асноўнае прызначэнне зводзілася да абуджэння нацыянальных меншасцей, уздыму іх нацыянальнай годнасці, паказу сацыяльнай і нацыянальнай няроўнасці ў польскай дзяржаве. У канцы 20-х і асабліва ў 30-х гг. ХХ ст. з'явіліся першыя манаграфічныя даследаванні, у якіх асвятлялася складанае эканамічнае і палітычнае становішча насельніцтва тэрыторыі Беларусі, якая была акупіравана Польшчай. У працах раскрывалася дзейнасць шматлікіх арганізацый супраць захопніцкай палітыкі польскага ўрада, асабліва супраць наступлення ўлад на палітычныя і нацыянальна-культурныя правы беларусаў [1]. Іх каштоўнасць у тым, што многія аўтары з'яўляліся ўдзельнікамі тых падзей і з найбольшай паўнатой імкнуліся паказаць сутнасць польскай акупацыйнай палітыкі на захопленых тэрыторыях і



Рэпазіторый БДПУ

тыя шматлікія парушэнні ўмоў Рыжскага мірнага дагавора 1921 г., які ўчыняліся польскімі ўладамі ў адносінах нацыянальных меншасцей.

Згодна рашэнняў Рыжскага дагавора польскія кіруючыя колы аба вязваліся забяспечваць для ўсіх нацыянальных меншасцей роўны палітычныя правы і свабоднае развіццё культуры і веравызнання. Так у сёмым артыкуле дагавора было пазначана, што «Польша предос тавляет лицам русской, украинской и белорусской национальности находящимся в Польше, на основе равноправия национальностей все права, обеспечивающие свободное развитие культуры, языка и выполнения религиозных обрядов. Взаимно Россия и Украина обес печивают лицам польской национальности, находящимся в России Украине и Белоруссии, все те же права.

Лица русской, украинской и белорусской национальности в Поль ше имеют право, в пределах внутреннего законодательства, культи вировать свой родной язык, организовывать и поддерживать свои школы, развивать свою культуру и образовывать с этой целью общества и союзы. Этими же правами, в пределах внутреннего зако нодательства, будут пользоваться лица польской национальности находящиеся в России, Украине и Белоруссии».

Аднак польскія ўрадавыя колы і не дбалі пра выкананне палажэн няў дагавора. Прыгожы лозунг «За вашу і нашу свабоду!», які прапана валі і шырока прапагандавалі польскія рэвалюцыйныя сілы ў час ба рацьбы з расійскім царызмам, аказаўся зусім забытым. Сутнасць унутранай палітыкі польскіх улад у міжваенны перыяд можна вызна чыць як «Польшча для палякаў.» Перамагла канцэпцыя, сфармулява ная ў лагеры нацыянал-дэмакратаў, так званых эндэкаў, ідэрам якіх з'яўляўся вядомы польскі палітычны дзеяч і публіцыст Раман Дмоўскі У радзе сваіх прац — «Мысли современного поляка» (1903), «Герма ния, Россия и польская проблема» (1908), «Польская политика и воз рождение государства» (1925) — ён абгрунтаваў ідэю «інкарпара цыі» — уключэння беларускіх і ўкраінскіх земель у склад польскай дзяржавы. «Там, дзе мы можам памножыць свае сілы і сваю цы вілізацыйную працу, паглынаючы іншыя элементы, ні адно права не зможа забараніць нам гэтага, а дзейнічаць так ёсць нашым абавяз кам» [2]. У практычнай дзейнасці польскіх улад адносна нацыяналь ных меншасцей папіраліся не толькі артыкулы Рыжскага мірнага дага вора і Версальскага трактата, але нават і Канстытуцыі Польшчы.

Напярэдадні Першай сусветнай вайны ідэя набыла завершаны выгляд. У адпаведнасці з гэтай канцэпцыяй беларусам і украінцам як народам «негістарычным» і «недзяржаўным» адказвалася ў праве мець асабістую дзяржаўнасць. У Польшчы праводзілася пасля доўная, наступальная і бескампрамісная асімілятарская палітыка,



якая ажыццяўлялася метадамі эканамічнай, палітычнай, ідэалагічнай і культурна-асветніцкай дыскрымінацыі нацыянальных меншасцей, якія ўмацняліся з дапамогай жорсткіх рэпрэсій і пераследаванняў.

У шматлікіх працах, якія былі падрыхтаваны беларускімі гісторыкамі ў пасляваенны перыяд, паказвалася не толькі сутнасць урадавай палітыкі Польшчы ў адносінах да нацыянальных меншасцей і розныя формы барацьбы супраць польскага засілля, але і асвятляліся падзеі уз'яднання народа Заходняй Беларусі з БССР. Ужо ў 1948 г. Ц. С. Гарбуноў выдаў у Маскве працу «Воссоединение белорусского народа в едином Советском социалистическом государстве», у якой упершыню ў абагуленым выглядзе імкнуўся паказаць складаны працэс уз'яднання беларускага народа ў адзінай дзяржаве. Асабліва актыўна праблема пачала распрацоўвацца пасля прынятых XXII з'ездам КПСС рашэнняў. Былі выдадзены зборнікі ўспамінаў былых дзеячаў, шматлікія артыкулы і манаграфіі, абаронены кандыдацкія і доктарскія дысертацыі [3].

У пасляваенных працах даследчыкі імкнуліся паглыбіць навуковыя даследаванні, асабліва ў рэчышчы выяўлення дзейнасці КПЗБ. Асноўная ўвага ўдзялялася пераважна паказу кіруючай ролі партыйных арганізацый рэвалюцыйным і нацыянальна-вызваленчым рухам у Заходняй Беларусі. У часопісе «Камуніст» (органе ЦК КПСС) у маі 1961 г. быў змешчаны рэдакцыйны артыкул «За правильное освещение истории Компартии Западной Белоруссии», які з'явіўся для даследчыкаў своеасаблівай метадалагічна-ідэалагічнай канцэптуальнай устаноўкай для далейшага вывучэння складаных сацыяльна-эканамічных, палітычных і нацыянальна-культурных працэсаў, што адбываліся ў Заходняй Беларусі. Праўда, на самой справе асноўная ўвага звярталася на вывучэнне і паказ пазітыўнай дзейнаці арганізацый КПЗБ і КСМЗБ, а пралікі і памылкі звычайна не аналізаваліся, стваралася празмерна ідэальная карціна развіцця барацьбы.

У адказ на патрабаванні ЦК КПСС у 1966 г. у выдавецтве «Беларусь» была выдадзена калектыўная манаграфія «Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг) [4]. Ва уводзінах даследавання адзначана, што ў манаграфіі «поставлена цель осветить весь революционный путь КПЗБ, показать ее организационную и руководящую роль в революционной и национально-освободительной борьбе трудящихся, формы и методы ее работы в массах. В книге рассматриваются и отдельные, допущенные КПЗБ ошибки, вызванные поисками ею путей правильного применения ленинской стратегии и тактики в конкретных условиях Западной Белоруссии» [4, с. 14]. У гэтай фундаментальнай працы аўтары ўпершыню абагулілі назапашаны вопыт вывучэння ў айчыннай і польскай



Рэпазіторый БДПУ

гістарыяграфіі праблем барацьбы беларускага народа Заходн
Беларусі за нацыянальна-культурныя, сацыяльна-эканамічныя пра
і ўз'яднанне ў адзінай дзяржаве. Зразумела, што час наклаў адбітак
некаторыя ацэнкі і высновы, але фундаментальнасць падыходу, б
гацце дакументальных архіўных крыніц, якія прыведзены ў дасле
ванні, спроба комплексна паказаць складаныя сацыяльна-эк
намічныя, палітычныя і нацыянальна-культурныя падзеі, заслугоўв
юць станоўчай ацэнкі і ў наш час.

Важным этапам вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі з'явілі
70—80 гг. XX ст. У гэты час у айчыннай гістарыяграфіі з'явілася шэр
навуковых прац, у якіх значна пашырана праблематыка навуковы
даследаванняў. Гісторыкі асэнсоўвалі не толькі пытанні дзейнас
КПЗБ і рэвалюцыйнага руху, але і праблемы развіцця сельскай гасп
даркі, прамысловасці, друку. У гэтым шэрагу варта назваць прац
П. І. Зялінскага, І. М. Ігнаценкі, С. У. Кабяка, А. М. Мацко, У. А. Палуян
У. Ф. Ладысева, І. Царука, А.А. Сарокіна і інш. [5]. Агульная большас
прац выканана з шырокім выкарыстаннем архіўных дакументальн
крыніц, але ў класічнай савецкай метадалагічнай школе. У вынік
гэтага па-за межамі даследаванняў заставаліся многія праблем
асабліва дзейнасць Беларускай сялянска-работніцкай грамады, Тав
рыства беларускай школы, некамуністычных маладзёжных арганіз
цый і іншых палітычных і грамадскіх арганізацый.

Разам з тым аналіз названых і шматлікіх іншых навуковых
публіцыстычных прац, якія ўбачылі свет у акрэслены перыяд, дазв
ляе сцвярджаць, што палітычныя колы Польшчы былі не ў стан
пазітыўна адказаць на выклік часу. Іх неканструктыўнаю дзейнасцю
адносінах нацыянальных меншасцей Заходняй Беларусі былі створ
ны шматлікія праблемы ў сацыяльна-эканамічнай і нацыянал
на-культурнай сферы, рэлігійным і палітычным жыцці. Іх невыраша
насць з'яўлялася не толькі каталізатарам, але і спрыяльнай сацыял
на-палітычнай перадумовай для ўз'яднання беларускага народ
Большасць беларусаў не магла мірыцца з грубымі парушэннямі ўла
дай іх канстытуцыйных праў і была ўнутрана падрыхтавана для в
праўлення гістарычнай несправядлівасці і ўз'яднання ў адзінай бел
рускай дзяржаве.

Новым і вельмі важным этапам у гістарыяграфіі вывучэння гіст
рыі Заходняй Беларусі з'явіліся 90-я гг. XX ст. За гэты час і ў пачатк
новага тысячагоддзя з'явілася шмат навуковых прац, аўтары як
імкнуцца з навуковых нацыянальна-дзяржаўных метадалагічных п
дыходаў асвятляць многія старонкі мінулага нашай краіны. За апошн
гады адбылося шмат навукова-тэарэтычных канферэнцый, на як
узнімаліся праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Напрык



...д, у верасні 1999 г. па ініцыятыве прафесара У. Ф. Ладысева ў БДУ
была праведзена Міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя,
...свечаная 60-годдзю ўз'яднання беларускага народа. У шматлікіх
...тупленнях былі ўзняты многія актуальныя праблемы, якія недас-
...ткова асветлены ў айчыннай гістарыяграфіі. Станоўчым момантам
...следчай практыкі айчынных гісторыкаў можна назваць той факт,
што большасць даследаванняў выканана з выкарыстаннем раней не
...ведзеных у навуковы ўжытак архіўных дакументаў, крытычным
...налізе айчыннай і замежнай літаратуры [6]. Так, у паведамленні
...Ф. Кушнера «Асвятленне гісторыі Заходняй Беларусі 1921—1941 гг.
у сучаснай беларускай гістарыяграфіі», з якім ён выступіў на канфе-
...нцыі, былі прааналізаваны многія навуковыя працы, апублікаваныя
у 90-х гг. Аўтар акрэсліў шэраг актуальных праблем, што на яго думку
...патрабуюць паглыбленага навуковага асэнсавання [7].

На міжвузаўскай навукова-практычнай канферэнцыі, праведзенай
у кастрычніку 1999 г. у Брэсце і прысвечанай 60-й гадавіне ўз'яднання
Заходняй Беларусі з БССР, прынялі ўдзел каля 50 навукоўцаў. У мно-
...іх паведамленнях былі ўзняты праблемы, якія да апошняга часу сла-
...ба распрацаваны ў айчыннай гістарычнай літаратуры. Так, А. М. Ва-
...ніловіч прывёў шэраг новых матэрыялаў аб стане адукацыі ў Заход-
...няй Беларусі напярэдадні верасня 1939 г. Дзейнасць Таварыства бе-
...ларускай школы на яскравых прыкладах была асветлена ў
...выступленні П. І. Гарбуль і І. М. Навіцкай, праблемы нацыянальна-дэ-
...макратычнага руху раскрылі П. С. Рамановіч і А. М. Баюра. Пра аграр-
...ныя пераўтварэнні на Берасцейшчыне ў прадваенны перыяд ішла
...размова ў паведамленні Л. І. Ермаковіч, пытанні антырэлігійнай пра-
...паганды ў заходніх абласцях Беларусі ўзняў Э. С. Ярмусік. Рэлігійны
...аспект ўз'яднання беларускага народа быў акрэслены ў выступленні
...С. М. Васовіч [8].

Станоўчую ацэнку ў навуковых колах і грамадскасці атрымала на-
...вукова-папулярнае выданне «Назаўсёды разам: Да 60-годдзя ўз'яд-
...нання Заходняй Беларусі з БССР.» У кнізе змешчана шмат грунтоўных
...навуковых артыкулаў, якія былі падрыхтаваны вядомымі даследчы-
...камі на падставе раней невядомых дакументальных крыніц, а таксама
...арыгінальныя дакументы і фотаздымкі. У кнізе з навуковых нацыя-
...нальна-дзяржаўных пазіцый асвятляюцца складаныя сацыяль-
...на-палітычныя працэсы на тэрыторыі Заходняй Беларусі напярэдадні
і ў час вераснёўскіх падзей [9].

Нельга не адзначыць гістарыяграфічныя працы, змешчаныя ў
...зборніку «Сучасныя праблемы гістарыяграфіі». У спецыяльным раз-
...дзеле «Распрацоўка гісторыі Беларусі савецкага і постсавецкага часу.
Гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі» апублікавана шэраг



Рэпазіторый БДПУ

змястоўных артыкулаў. Даследчыкі ажыццявілі аналіз стану навукова га вывучэння ў гістарыяграфіі праблем аб'яднання Беларусі, нацы нальных меншасцей, праваслаўнай царквы, студэнцкіх арганізацы краязнаўчага руху, аграрных пытанняў і адукацыі [10].

У святле акрэсленай праблемы нельга не назваць працы малады навукоўцаў В. В. Даніловіча і В. І Крывуця. Так, у працах В. В. Да ніловіча ўпершыню асветлены вытокі ўтварэння і дзейнасць пасол скага клуба «Змаганне» ў польскім сейме [11]. Новыя старонкі дзе насці маладзёжных арганізацый паказаны ў даследаваннях В. І. Кры вуця. Ім упершыню выяўлены тры плыні, якія меліся ў маладзёжны руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі, у абагуленым выглядзе паказа на супрацьстаянне і барацьба падрастаючага пакалення за ўз'ядна не беларускага народа [12].

Нельга не выдзеліць даследаванні прафесара У. І. Ладысева, я шмат увагі ўдзяляе вывучэнню праблем, звязаных з уз'яднаннем бе ларускага народа. Так, напярэдадні 17 верасня 2004 г. у выдавецтв БДУ выйшаў падрыхтаваны ім зборнік дакументаў і матэрыялаў «Бе ларуская нацыя: уз'яднанне. Верасень 1939 г. — чэрвень 1941 г. Зборнік дакументаў і матэрыялаў.». У кнізе змешчана вялікая кол касць раней невядомых дакументальных матэрыялаў, у якіх адлюст раваны падзеі, звязаныя з уз'яднаннем беларускага народа ў адзіна нацыянальнай дзяржаве, палітычных, сацыяльна-эканамічных і кул турных пераўтварэннях. У першай часцы працы «Адзінства, выпраб ванае часам і жыццём» аўтар сцісла, але дакументальна пераканаўч абвяргае розныя інсінуацыі, якія існуюць у замежнай і айчыннай гіст рыяграфіі наконт правамернасці ўз'яднання этнічна беларускіх зя мель у 1939 г. Навуковец прыводзіць шэраг дакументальных крыніц якія красамоўна ілюструюць беспадстаўнасць тэзіса «новая акупа цыя», які імкнуцца ўнядрыць у беларускае асяроддзе некаторыя за межныя выданні [13].

Сярод прац апошніх гадоў патрэбна назваць даследаванне канды дата гістарычных навук А. В. Ціхамірава. У 2003 г. у друку з'явілася яго манаграфія «Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду пасля ваеннага ўладкавання ў Еўропе і польска-савецкай вайны (1918—1921 гг.)», дзе на багатым факталагічным матэрыяле раскры ваюцца складаныя праблемы савецка-польскіх адносін і станаўлення беларускай дзяржаўнасці. На арыгінальных дакументальны матэрыялах у працы паказваецца шматмернасць палітычных падзей навязванне міжнароднай супольнасцю ўмоў заключэння Рыжскага да гавора, што прывяло да падзелу этнічна беларускіх тэрыторый [14].

Адзначаючы станоўчыя тэндэнцыі і дасягненні айчыннай гістары яграфіі, неабходна звярнуць увагу і на некаторыя сур'ёзныя недапра



Рэпазіторый БДПУ

ы і хібы. Аналіз прац паказвае, што некаторыя навукоўцы, гаворачы аб навуковым нацыянальна-дзяржаўным падыходзе пры асвятленні падзей уз'яднання беларускага народа, заяўляюць аб «акупацыі тэрыторыі», другія сцвярджаюць аб «захопе зямель», іншыя — аб «ўтаржэнні» войск Чырвонай Арміі ў межы II Рэчы Паспалітай. Тым самым паўтараюць канцэптуальныя канструкцыі, якія створаны прадстаўнікамі польскай гістарыяграфіі. Такія высновы, на наш погляд, не толькі не маюць навуковых падстаў, але і з'яўляюцца палітычна небяспечнымі. Зразумела, што калі ў беларускай гістарычнай навуцы будзе прыняты тэзіс аб тым, што ў верасні 1939 г. адбылася «акупацыя войскамі Чырвонай Арміі зямель II Рэчы Паспалітай», то праз пэўны час такая ацэнка можа стаць падставай для пэўных польскіх заяў аб вяртанні «акупіраваных» тэрыторый.

Апублікаваныя працы пераканаўча сведчаць, што большасць айчынных даследчыкаў на падставе дакументальных крыніц сцвярджаюць аб польскай акупацыі беларускіх зямель у час польска-савецкай вайны 1919—1920 гг., а Рыжскі дагавор без згоды беларускага боку ўзаконіў гэты тэрытарыяльны захоп. Дзейнасць палітычных колаў БССР у верасні 1939 г. была накіравана на захаванне дзяржаўнай цэласнасці і ліквідацыю гістарычнай несправядлівасці ў адносінах беларускага і ўкраінскага народаў.

Некаторыя даследчыкі ў сваіх працах прыводзяць пераканаўчыя дакументальныя матэрыялы аб сур'ёзных парушэннях правячым рэжымам Польшчы нацыянальна-культурных і рэлігійных праў беларусаў. Аднак, пазаёміўшыся з высновамі працы, здаецца, іх рабіў іншы аўтар. Так, асвятляючы рэлігійнае жыццё ў Заходняй Беларусі гісторык У. І. Навіцкі прыводзіць пераканаўчыя матэрыялы аб наступленні польскага Касцёла на праваслаўных вернікаў, закрыцці праваслаўных прыходаў, насільна ці па «рашэнні» судоў праваслаўныя храмы перадаваліся католікам. Між тым вывад робіцца такі: «Да верасня 1939 г. усе канфесіі знаходзіліся ў добрым арганізацыйным стане, кожная асоба мела магчымасць спавядаць любую рэлігію або быць атэістам...» [15]. Немагчыма пагадзіцца з такой высновай. Крыніцы сведчаць аб тым, што з сярэдзіны 30-х гг. XX ст. польскі ўрад пачаў актыўна праводзіць палітыку паланізацыі Праваслаўнай царквы. Ужо да 1936 г. у праваслаўных вернікаў было адабрана праз суды і насільна 1300 храмаў. Рымска-каталіцкая вера была ўведзена ў абавязковым парадку ў вучэбны працэс ва ўсіх школах. Польскі ўрад актыўна падтрымліваў рух за аддзяленне Праваслаўнай царквы ад Маскоўскага патрыярхата.

А вось да якога «адкрыцця» прышоў пачынаючы гісторык А. М. Загідулін. У артыкуле «Нацыянальная палітыка ў адносінах да

беларусаў у II Рэчы Паспалітай», які быў апублікаваны ў «Беларускі гістарычным часопісе», аўтар сцвярджае: «Такім чынам, стваральні польскай нацыянальнай і канфесіянальнай палітыкі бачылі асноўну перашкоду рэалізацыі сваіх пачынанняў у нежаданні мясцова адміністрацыі рабіць нейкія ўступкі беларусам і ўкраінцам» [16]. Во так, ні больш і ні менш. Мясцовыя «сваволькікі» дыктавалі ўраду н цыянальную палітыку. А між тым перад гэтым вывадам аўтар пры водзіць цікавыя фактычныя матэрыялы і сцвярджае «...рэальна ў ка цы 1930-х гадоў пачалася адкрытая паланізацыя беларусаў.» І далей «Служба дзяржаўнай бяспекі (дэфензіва) і дзяржаўная адміністрацы пільна сачылі за ўсімі праявамі грамадскай дзейнасці нацыянальны меншасцей... Кожны паліцэйскі ўчастак меў сваю агентурную сетку спіс асоб, якіх можна было выкарыстаць. Такая праца добра аплочва лася — ад 20 да 100 злотых за адну «справаздачу». Як бачна, нава прыведзеныя намі фактычныя матэрыялы не дазваляюць даследчык рабіць высновы аб тым, што віной усяму ў нацыянальнай палітыцы да ваеннай Польшчы былі мясцовыя клеркі, сутнасць была ў дзяржаўна палітыцы, якая праводзілася ў адносінах да нацыянальны меншасцей.

*Літаратура*


1. Лучанін М. Заходняя Беларусь пад панаваннем Польшчы. Мн., 1926; Б ген Д. Преследование нацменьшинств в Польше. М. 1927; Западная Бел руссия на скамье подсудимых: Сб. Мн., 1929; Сталевіч А. Заходня Беларусь — калонія Польшчы. Мн., 1930; Якаўлеў Л. Заходняя Беларусі Мн., 1931; Крыўда Я. Супраць нацыянальнага прыгнёту і абшарніча-поль скай акупацыі. Вільна, 1932; Багданскі Я., Бабровіч Л. Аб класавай бараць бе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай сялянска-рабочай грамады Мн., 1932; Курковіч М. За што судзілі рэвалюцыйных сялян у Кобрыне Вільна, 1933; Падгайскі М. Вялікая барацьба лесарубаў. Вільна, 1934; Ва левіч І. Р. Першыя гады Кампартыі Заходняй Беларусі. Успаміны падпо льшчыка. 1921—1925 гг. Мн., 1935;Минаев В. Западная Белоруссия и За падная Украина под гнетом панской Польши. М., 1939; Егоров Г. Западна Белоруссия. М., 1939; Минский Г. Под игом польских панов. М., 1939; Лоч мель И. Ф. Очерк истории борьбы белорусского народа против польски панов. М., 1940; Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне Мн., 1940.
2. Wapinski R. Narodowa Demokracja. 1893—1939. Ze studiow nad dziejam mysli nacjonalistycznej. Wroclaw, 1980. S. 42.
3. Горбунов Т. Воссоединение белорусского народа в едином Советском со циалистическом государстве. М., 1948; Арэхва М. Рэвалюцыйны рух у За ходняй Беларусі ў гады белапольскай акупацыі. Мн., 1958; У суровыя гад падполля». Мн., 1958; Анісаў С. За волю і шчасце народа. Мн., 1959 Materialy z sesji popularno-naukowej, poswiecnej dzialalnosci Komunistyczne Partii Polski na terenie Bialostoczczyzhy». Белосток, 1960; Слаўная дачка





беларускага народа. Пісьма, артыкулы В. Харужай і ўспаміны аб ёй. Мн., 1960; Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: Док. и материалы. Мн., 1962. Т. 1 (1921—1929 гг.).; Полуян В., Полуян И. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920—1939 гг. Мн., 1962; Глинская Т. Ю. КПЗБ в борьбе за завоевание трудящихся масс (1924—1928 гг.) Мн., 1962; Мацко А. Н.. Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против фашизма (1933—1939 гг.). Мн., 1963; Маўпшасаў С. На разгневанай зямлі. Мн., 1963; Вильнюсское подполье. Воспоминания участников революционного движения в Вильнюсском крае (1920—1939 гг.). Вильнюс, 1966.
4. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.). Мн., 1966
5. Анципович Н. В. Свободомыслие и атеизм в Западной Белоруссии в 1919—939 гг. Мн., 1988; Зелинский П. И., Ракевич Н. А. Печать КПЗБ в борьбе за свободу. Мн., 1977; Игнатенко И. М., Мацко А. Н. Дорогой борьбы и созидания. Мн., 1979; Кобяк С. В. Под знаменем пролетарской солидарности. Мн., 1979; Кухарев Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919—1939 гг.). Мн., 1975; Ладысеў У. Ф. КПЗБ — арганізатар барацьбы працоўных за дэмакратычныя правы і свабоды (1933—1934 гг.). Мн., 1976; Ладысеў У. Шлях да свабоды . З гісторыі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1919—1939 гг. Мн., 1978; Ладысев В. Ф. В борьбе за демократические права и свободы. Мн., 1988; Мацко А. Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков. Мн., 1972; Полуян В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927—1939 гг.). Мн., 1978; Сорокин А. А. Освободительное и крестьянское движение в Западной Белоруссии (1920—1939 гг.). Мн., 1970;
6. Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф. 17—18 верасня 1999 г., Мн., 2000.
7. Кушнер В. Ф. Асвятленне гісторыі Заходняй Беларусі 1921—1941 гг. у сучаснай беларускай гістарыяграфіі // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф. 17—18 верасня 1999 г., Мн., 2000. С. 295—308.
8. Исторические, социокультурные и экономические аспекты воссоединения белорусского народа // Материалы межвузовской науч.-практ. конф. преподавателей, аспирантов и студ., посвященной 60-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР. 26—27 октября 1999 г. Брест, 2000.
9. Назаўсёды разам: Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Мн., 1999.
10. Сучасныя праблемы гістарыяграфіі: Матэрыялы Рэспубл. навук.-практ. канф. Мінск, 28 лістапада 2003 г.: У 3-х ч. Мн., 2003. С. 401—633.
11. Вытокі арганізацыі «Змаганне» // Весці БДПУ. 1998. № 2. С. 90—96; Друк арганізацыі «Змаганне» // Пытанні гісторыі Беларусі: Зб. навук. арт. / Пад агульн. рэд. А. М. Лютага. Мн., 1998. С. 80—85; Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» па падрыхтоўцы да Еўрапейскага сялянскага кангрэса // Пы-